# ЭТНАГЕНЭЗ БЕЛАРУСАЎ: ДА ГІСТОРЫІ ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ

**П. С. Клімовіч**

*Дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога, Беларусь*

Навуковы кіраўнік П. П. Бухавец, магістар гіст. навук

Кожны з нас, хоць раз у сваім жыцці, задумваецца, чые мы нашчадкі? Адказ на гэтае, здаецца простае і даўняе пытанне, да сённяшняга дня нягледзячы на яго даўнасць так і не з'яўляецца завершаным і поўным. І ставіць тут кропку заўчасна, хоць трэба адзначыць што мы значна наблізіліся да разумення праблемы этнагенэзу беларусаў. Тэрмін этнагенэз паходзіць ад спалучэння двух грэчаскіх слоў (έθνος – племя, народ і γένεσις – паходжанне, утварэнне). Такім чынам этнагенэз беларусаў – працэс станаўлення і фарміравання народа, які на працягу сваёй гісторыі ўключаў такія формы як змяшэнні (міксацыі), асіміляцыі, інтэграцыі розных плямён і народаў [1, с. 4].

Трэба сказаць што пытанне этнагенэзу беларусаў узнікла ўжо ў межах Расійскай імперыі. Звязаць гэта можна ў цэлым з узнікненнем і развіццём такой навукі як этналогіі. Акрамя таго да вывучэння ў гэтым накірунку падштурхнулі шляхецкія паўстанні на Беларусі. Так, сутыкненне палітычных інтарэсаў палякаў і

рускіх на беларускіх землях перамясцілася ў сферу гісторыі. Кожны з варагуючых бакоў імкнуўся ўключыць Беларусь у сферу свайго ўплыву і ідэалагічна абгрунтаваць свае прэтэнзіі на этнічную тэрыторыю беларусаў. Паўстанне 1863–1864 гг. падштурхнула расійскія афіцыйныя колы да захадаў якія б замацавалі правамоцнасць прэтэнзіяў на «Паўночна-Заходні край» як тады ў афіцыйным ўжытку называлі Беларусь. У першую чаргу ў гэтую працу ўключыліся гісторыкі імперыі, якія павінны былі абгрунтаваць ідэалагічную справядлівасць знаходжання гэтай зямлі і народу ў складзе Расійскай імперыі. Даказваць гэтае збіраліся не толькі мясцовым жыхарам, ды жыхарам Расійскай імперыі, але і Заходняй Еўропе. Так, у выданні падрыхтаваным у 1865 г. на рускай і французскай мовах сцвярджалася што, «абодва гэтыя плямёны – беларусы і маларусы – той жа рускі народ, што яны не могуць быць прылічаны да польскага народу» [2, с. VI]. Так ўзніклі дзве супрацьлеглыя кан-цэпцыі паходжання беларусаў – «велікапольская» і «велікаруская». Прыхільнікі абедзвух сыходзіліся ў тым, што адмаўлялі існаванне самастойнага беларускага этнасу на той падставе, што ў насельніцтва Беларусі быццам не было самастойнай славянскай мовы [1, с. 19].

У пачатку XX ст. нараджэнец Гродзенскага павету, выдатны славіст і акадэмік Пецярбурскай Акадэміі навук, Я. Карскі, ў фундаментальнай працы «Беларусы» пераканаўча даказаў, што беларуская мова з'яўляецца самастойнай славянскай мовай, якая паводле свайго лексічнага складу, сінтаксісу, фанетыкі і марфалогіі ўваходзіць у групу ўсходнеславянскіх моў нароўні з велікарускай і ўкраінскай. Ён жа быў заснавальнікам новай канцэпцыі, асновай якой быў тэзіс аб тым, што продкамі беларусаў былі крывічы, дрыгавічы, радзімічы [3, с. 64–65]. Гэтая канцэпцыя мела сваіх прыхільнікаў у беларускай савецкай гістарычнай навуцы, такіх вядомых навукоўцаў як як У. Пічэта і М. Грынблат. Асноўная іх аргументацыя грунтуецца на вывучэнні распаўсюджвання традыцыйных земляробчых прылад і асаблівасцей гаворак у розных рэгіёнах Беларусі [4, с. 7].

Амаль у той жа час ўзнікае «крывічская» канцэпцыя якая заснавана на ўяўленні, што амаль усе асаблівасці, якія адрознівалі ўкраінцаў і рускіх ад беларусаў, пераняты апошнімі ад крывічоў. Гэтаму надавалася такая вялікая ўвага, што беларусы і крывічы амаль атаясамляліся. Гісторык В. Ластоўкі выказваў меркаванне, што беларусаў трэба называць крывічамі, а Беларусь – Крывіяй [5, с. 4–5].

У пасляваенны перыяд, у нас атрымала распаўсюджанне канцэпцыя ўтварэння адзінай «старажытнарускай» народнасці. Прыхільнікі гэтай канцэпцыі этнограф В. Бандарчык, гісторык Я. Карнейчык лічылі, што продкамі беларускага народу была адна з трох частак агульнага ўсходнеславянскага этнасу, які ў сярэдневечных пісьмовых крыніцах названы рускім, а ў навуковай літаратуры – старажытнарускім. Трэба сказаць, што гэтая канцэпцыя атрымала шырокае распаўсюджванне ў навуковай і вучэбнай літаратуры ў 1950–1980 гг. [5, с. 5].

У 1970-я гг. фарміруецца «балцкая» канцэпцыя беларусаў. Паводле яе продкамі беларусаў былі славяне і балты. Так, расійскі археолаг В. Сядоў лічыў, што аб гэтым сведаць некаторыя элементы традыцыйнай беларускай культуры і мовы (культ вужа, жаночы галаўны ўбор намітка, цвёрды «р» і інш.). Аргументам гэтай канцэпцыі лічацца таксама назвы беларускіх рэчак (Сож, Рэста, Клёва, Арэса і інш.) [5, с. 4]. У савецкі час гэтая канцэпцыя не атрымала шырокага распаўсюджвання і была вядомая толькі сярод вузкага кола спецыялістаў, бо яна ў значнай ступені падрывала погляды савецкіх ўладных элітаў на беларускі народ як малодшага брата рускага народу і іх агульнага усходнеславянскага кораня.

Напрыканцы 1980-х нараджэнец г. Гомеля І. Ласкоў стварыў «фінскую» канцэпцыю. Згодна з ёй продкамі беларусаў былі славяне і фіны. У якасці доказаў ён спасылаецца на тое, што некаторыя назвы рэк Беларусі маюць фінскае паходжанне [4, с. 6].

У пачатку 1990-х гг. беларускім гісторыкам і этнолагам М. Піліпенкам была створана «старажытнабеларуская» канцэпцыя. Стваральнік і прыхільнікі гэтай канцэпцыі лічаць, што непасрэнымі і асноўнымі продкамі беларускага народу былі дзве вялікія групы ўсходнеславянскай агульнасці – старажытныя беларусы і старажытныя палешукі, пры гэтым беларускі этнас шляхам кансалідацыі паўночнай часткі старажытнабеларускага (падзвінска-дняпроўскага) і паўднёвай часткі старажытнапалескага (папрыпяцкага) субэтнасаў. Акрамя іх у склад беларускага этнаса ўліліся асобныя групы заходнеславянскага (польскага), балцкага (літвы, жэмайтаў, латыголы, прусаў, яцвягаў) і цюркскага насельніцтва. Беларускі народ сфарміраваўся ў познім сераднявеччы пасля распаду Русі ў рамках новай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага [5, с. 5].

Такім чынам за паўтарастагоддзі створана вялікая колькасць канцэпцый паходжання беларускага народу, якія часам узамавыключаюць адна адну. За гэты час адбываўся паступовы працэс пашырэння крыніцавай базы гэтай складанай праблемы. Зараз выкарыстоўваюцца дадзеныя такіх навук як антрапалогія, археалогія, гісторыя, этнаграфія, этналогія, фалькларыстыка, гістарычнае мовазнаўства, а ў апошні час і генэтыка. Комплексны падыход і далейшае пашырэнне кола крыніц у будучым павінны даць яшчэ больш аб’ектыўнае ўяўленне аб праблеме этнагенэзу беларусаў.

Літаратура

1. Цітоў, В. С. Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Краіна і людзі / В. С. Цітоў. – 2-е выд. – Мінск : Беларусь, 2001. – 208 с.
2. Документы, объясняющие историю Западно-русского края и его отношение к России и к Польше. – СПб : Тип. Эдуарда Праца, 1865. – 658 с.
3. Карский, Е. Ф. Белорусы : в 3 т. / Е. Ф. Карский. – Варшава : Тип. Варшав. учеб. окр., 1903. – Т. 1 : Введение в изучение языка и народной словесности. – 466 с.
4. Беларусы : у 13 т. / рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.] – Мінск : Беларус. навука, 1995–2012. – Т. 4 : Вытокі і этнічнае развіцце / В. К. Бандарчык [і інш.]. – 2001. – 433 с.
5. Пилипенко, М. Концепции происхождения белорусов / М. Пилипенко // Наука и инновации. – 2011. – № 9. – С. 4–5.